ВЕРУ ВЯСНЕ

Я не знайшоў адказу ў лета,
Чаму у жніўні кожны год
Буслам не хочацца ў палёт
І ці патрэбна вельмі гэта?..

Як не распытваў хітра восень:
Навошта ў слотны лістапад
Зямлі патрэбен снегапад? –
Пачуць адказу не ўдалося...

Дазнацца спрабаваў зімою:
Адкуль аб гэтае пары
У нашым садзе снегіры? –
Яна тлумачыла не тое...

Адна вясна, сустрэўшы вырай,
Пад звонкі пошчак салаўя
Была шчаслiваю і шчырай:
“Тут Беларусь!
І крыху я!..”

***

Абвясціла сонца: я ўзышло!
Хопіць, дружа, песціцца ў пасцелі!
Сны твае даўно ўжо адляцелі
З птушкамі, што сталі на крыло...

Глянь, як упрыгожана
Уза Пасмамі бялёсага туману,
А на лузе так замілавана
Ззяе дыяментамі раса.

Добра адпачыўшыя ў начным,
Іх збіраюць ленавата коні,
А пастух немалады спрасоння
Не пярэчыць у занятку ім.

Паглядзі, сягоння колькі пчол
Абляпіла раніцаю кветкі!
Хай шчыруюць і вясной, і ўлетку,
Каб усіх парадаваць наўкол.

Пакідай жа свой хутчэй пакой,
Калі сам да радасці ахвочы:
З ёю стрэцца проста вочы ў вочы
Можна першым толькі раніцой!

## МАЙСКІ ДОЖДЖ

Падчас, як робяцца высновы,
Што дасць засеяны гектар,
Палеткам трэба дождж вясновы,
Бо ён цяпер - жыцця нектар.

І дождж зыходзіць з неба шчодра
На квецень яблыняў, ігруш,
Хоць падстаўляй пустыя вёдры
Ці сам прымай гаючы душ.

Пляскоча дождж, нібы па нотах,
Да кроплі кропля, пыркі, звон.
Не па прымусу, а ў ахвоту
Сцякае з хмар сягоння ён.

І парасон мне непатрэбны –
Я за яго не дам і грош,
Калі пануе чыстасрэбны,
Такі жаданы майскі дождж!..

# ЗАЛАТОЕ КОЛЬЦА ПАЛЕССЯ

Тураў, Чачэрск і Чырвоны Бераг,
Гомельскі парк, дзе дрэвам не цесна,
Юравічы, першабытны Бердыж –
Вось Залатое кольца Палесся.

Між балот у адзінстве суладным
Тут жылі дрыгавіч і радзіміч.
Яны й палеткам давалі рады,
Сябравалі з суседзямі ўсімі.

Іх Пярун бласлаўляў і Ярыла,
Прыпяць лес сплаўляла айчынны...
Ды з’явілася нейкая сіла,
Што паслала крыжы супраць плыні.

І цяпер яны ў краі палескім
Прарастаюць сапраўдным гранітам,
Абараняючы нас - грэшнікаў,
Каб з зямной не упалі арбіты!..

Калі мне, падарожнік, не верыш,
Нат у думках згаджацца не хочаш,
Сам наведай і Тураў, і Бердыж –
Ўсё пабачыні на ўласныя вочы.

РАДЗІМЕ

Я не лісток, сарваны ветрам:
Куды падзьме - ён і ляціць.
Мне даспадобы дома жыць,
Ўдыхаць сваіх бароў паветра.

Вясною, як паспее глеба,
Калі яе так прагне плуг,
І я ўзарaць бяруся круг –
У генах гэткая патрэба.

Люблю, як каласяцца гоні,
Ўбіраючы зямелькі сок,
Сарваць жытнёвы каласок,
Яго узважыць на далоні.

Люблю, як пахне верас сіні,
А ў ім не спіць начны дазор:
Баравікі -
              як на падбор! –
              Мяне заўважыўшы, застылі...

У нас і бульба, і рабіны,
Гуркі і парасонам кроп,
Чарніц - дык хоць збірай у сноп,
І пырскі спелыя каліны!..

Хапае ўсім - бацькам і дзецям...
І родны дзедаўскі куток
Вады гаючае глыток
Не пашкадуе, калі ў свеце

Патрэба стане на яе,
Паверце мне!..
...Я не лісток, сарваны ветрам!

СЛАВЫ НА ДАРОГУ

Употайкі, як выйшаў за парог,
Перахрысціла маці сына,
Каб горкі пыл нязведаных дарог
Гаючым стаў, як дым Айчыны.

І ён пайшоў адзін у белы свет,
Суровы і непрадказальны,
Каб выканаць матулі запавет,
Атрыманы ў хвіліны развітання:

Сабе не здраджваць і сваім сябрам,
Нямоглых радаваць хоць словам,
Жанчынам саступаць і святарам,
Не крыўдзіць, робячы высновы,

У вочы рэзаць праўду гультаю,
Пярэчыць ў спрэчках пустазвону,
Калі ж пакрыўдзяць родную зямлю,
Заўжды ўставаць на абарону.

Каб горкі пыл нязведаных дарог
Гаючым стаў, як дым Айчыны,
Употайкі, як выйшаў за парог,
Перахрысціла маці сына.

***

Галёкала рэха:
“Прыехаў, прыехаў!”
І радасна сэрца
Затахкала штось...
Дарэмна ты строга
Шаптала, дарога,
Што лесу маленства
Я страчаны госць.

І я ў прасвятленні
Упаў на калені:
“Даруй мне, даруй мне...” –
Бы клятву, шаптаў.
А ён замест слова
Лісточак кляновы
Ў далоні мае
Асцярожна паклаў!..

ЛЯСНАЯ ДАРОГА

Станцыя Прыбар - пяскі-барханы.
Машыну штурхай да Задораўкі.
Калісьці, кажуць, было тут мора,
Сёння ж бор і дубы-веліканы.

Цяжкай заўсёды была дарога:
Па ёй - на кані ці тупай пешшу,
Яшчэ на трактары, што урэшце
Выручаў нас усіх ад знямогі.

Выпадала і мне не аднойчы
Гразь мясіць у тваіх каляінах,
Альбо снег некранута-цалінны
Раніцой ці марознаю ноччу.

Сёння ўсё паўтарыць я не здатны:
У развілках тваіх заблукаю,
Тыя ж пяскі, а памяць не тая,
І патухнуў маяк роднай хаты...

ВЯСНА СТАРОГА ДУБА

Без вершаліны,
з парадзелай кронай,
з карой,
парэпанай за шмат гадоў...
Здалося мне:
не будзе больш зялёным,
не дачакацца ўвосень
жалудоў.
А ён марозы,
шэрыя завеі
трываў,
не наракаючы на лёс.
Ад ветру аж галіны
пачарнелі,
цнатлівасць засланяючы
бяроз.
Ды ледзь-ледзь сонца
цёплаю пяшчотай
марозы залюляла
ў ціхім сне,
ён выпрастаў галіны
і употай
сябе рыхтуе
новае вясне.
Струсіў павольна
ліст мінулагодні,
пад красавіцкім
вымыўся дажджом,
адчуўшы, што стаміўся
і галодны,
з зямелькі соку
сербануў нагбом...
...Пупышкі набрынялі,
як зярняты,
і распусціліся
лісткамі раніцой:
зноў перамог зіму
каржакаваты,
адваяваўшы права
на жыццё!..

## ЛІПА Ў ЧЫРКАВІЧАХ

Цябе, напэўна, само неба шкадавала,
Ці мо буслы, што паднаніліся гняздом,
Якія б тут стагоддзямі навалы
Не пралятали навальніцай ці дажджом
Ты і сягоння лашчыш хмары лісцем
І вабіш пчол у летні медазбор,
Хоць і не стромкая такая, як калісьці,
Калі не вёска тут была, а ціхі бор...
А потым раз запалкай чыркнулі –
І ёсць на карце вёска Чыркавічы...
Даўно тое было... І у цябе таксама
Кара гарэла, тлела і нутро,
Але ўцалела, дзякуй Богу, акрыяла:
Цяпер як успамін - адно дупло.
У ім у дождж хаваецца паўкласа
Мясцовых школьных блазнюкоў.
І ты не супраць, хоць апошнім часам
Шкадуеш больш падвоблачных буслоў
Бо яны за стагоддзі у Чыркавічах
Аніводнай запалкай не чыркнулі...

## СЛЯДЫ ПАМЯЦІ

Узгадваю я вуліцу Альхоўку,
Дзе і трыпутнік вольна рос, і крапіва,
Дзе нават след палутаркі гвалтоўны
Малюнак не псаваў - тут правіла трава.

Былі і для падводы каляіны,
Бо існаваў тады няпісаны закон:
Карову маеш - малако краіне
Прадай, калі не тону - хоць адзін бідон.

А на тры вёскі тут быў сепаратар,
І малако вазілі коньмі ў Целяшы...
Яшчэ бывала, што праедзе трактар, -
І зноў навокал цішыня і ні душы.

Ды гэтыя сляды не зарасталі.
І незалежна нават, сонечна ці дождж,
Тут побач мы штодзень тапталі
Свае дзіцячыя сцяжынкі басанож.

А зараз тут асфальт ды тратуары,
І ні трыпутніку пад плотам, ні травы.
Аб гэтым я і сам калісьці марыў,
Ссякаючы касой каліўе крапівы...

...Я сёння крочу вуліцаю роднай,
Пяшчотна ўзгадваю далёкія гады.
І праз асфальт нязвыкла-іншародны
Мае зноў бачацца дзіцячыя сляды.

# МОХ НА НОВУЮ ХАТУ

З георгіеўскім кавалерам Першай сусветнай,
Што ваяваў на руска-турэцкім фронце,
Мы дралі мох на новую хату ўлетку
За Яўстратаўкай на Заляддзі ў балоце.

Па калена ў вадзе ветэран і ўнук сумесна
Пад слякотным і зыркім ліпеньскім сонцам
Выносілі на сухое высокае месца
І рассцілалі мокрыя валаконцы.

Я трываў, хоць зайздросціў сябрам, што
ў Чарняўскім
Лесе майстравалі дружна тады зямлянку!
Быў бы з імі і я, а не ў балоце паганскім
Гразь мясіў да позняга вечара зранку...

Сёння тыя жаданні перагледзеў ахвотна
І цяпер шчанюком увязаўся б следам,
Калі б бацька-нябожчык не пускаў на балота
Мяне мох рыхтаваць са старэнькім дзедам...

З ПЕРШАГА СВЯТА СЛАВЯНСКАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ

У Тураве на Замкавай гары
І ў Ветцы, што Чарнобылем пазначана,
На роднай мове сёння гаварыў
Брат рускі, украінец, беларус з Ушачаў.

Нам перакладчыкаў не трэба - мы браты,
Таму й жывем стагоддзямі у згодзе,
Як завяшчаюць продкі з нематы,
Як марылі Кірыла і Мяфодзій.

***

Палярны дзень сканаў амаль,
Гусцее шэрае сутонне,
А каламуць салёных хваль
Глухім свінцовым гулам стогне.

“Задраіць люкі!” -
                    той загад
Матросы выканалі чотка:
На курс лажыцца акурат
І апускаецца падлодка.

А праз гадзіну будзе бой.
Які ён?
        Першы,
              ці апошні?..
...Стаміўся Сож, аціх прыбой,
Плыве у Ветку водар пожні...